Наскільки ж об’єктивно і правдиво аналізує та оцінює Ніцше християнство? Перш ніж погоджуватися чи заперечувати його думки, слід мати на увазі, що «Антихристиянин», де подано найбільш повний аналіз історичного розвитку християнства, писався філософом у період загострення душевної хвороби (Свасьян, с. 802). У цій праці поряд з глибокими інтуїціями «відчувається» розпад особистості автора (Свасьян, с. 803).

Крім того, головна трудність при осмисленні філософії Ніцше полягає у тому, «що там, де ми сподівалися знайти філософське вчення, ми виявляємо лише купу уламків» (Ясперс, 1994, с. 96). Його книги – це афоризми, листи, вірші, нариси, тому думки досить часто суперечливі. Це стосується і його оцінки християнства.

Але найголовнішою тенденцією у розвитку християнства Ніцше передбачив. Він переконливо показав, що західна метафізика, яка ґрунтувалася на платонізмі і християнстві, закінчує свій розвиток. Якщо Бог як основа сущого мертвий, і надчуттєвий світ ідей втратив свою цінність, то тепер не залишається нічого, на що б могла б спертися людина. Місце Бога займає ніщо, наступає епоха нігілізму.

**Список використаних джерел**


1. Ницше Ф. Веселая наука. Сочинения в 2-х т. М., 1990. Т. 1.
2. Ницше Ф. Антихрист. Сочинения в 2-х т. М., 1990. Т. 2.
3. Свасьян К.А. Примечание к «Антихристу». Ф. Ницше. Сочинения в 2-х т. М., 1990. Т. 2.
4. Хайдегер М. Слова Ницше «Бог мертв». Работы и размышления разных лет. М., 1993.
5. Ясперс К. Ницше й христианство. М., 1994.


* * *


***Дулаў Анатоль Мікалаевіч,***

кандыдат гістарычных навук, дацэнт, загадчык кафедры гісторыі Беларусі
Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П.М. Машэрава (Віцебск, Беларусь)


## Дыярыуш Самуіла Маскевіча як крыніца ваеннай гісторыі XVII ст.

Дыярыуш Самуіла Маскевіча (Samuel Maskiewicz) – крыніца добра вядомая даследчыкам. У Польшчы яго вывучалі літаратуразнаўцы (Б. Хлябоўскі, А. Сайкоўскі, М. Бауэр і інш.), выкарыстоўвалі ў сваіх працах гісторыкі (Т.Корзан, Р.Шчэсняк,

Т.Бохун, Я.Тазбір). У расійскай гістарыяграфіі Дыярыуш С.Маскевіча вядомы як крыніца гісторыі Смутнага часу. Варта адзначыць уклад у вывучэнне помніка даследчыкаў даўняй беларускай літаратуры А.Ф.Коршунава (1924–1991) і В.У.Таранеўскага (1954–2020). Яшчэ ў 1980-я гг. напісаць пра Дыярыуш у сваёй новай кнізе збіраўся буйнейшы беларускі крыніцазнавец М.М. Улашчык (1906–1986), але пайшоў з жыцця, паспеўшы зрабіць толькі чарнавыя накіды [8, с. 6–9]. Пасля гэтага айчынныя гісторыкі амаль не звярталі ўвагу на Дыярыуш. Сярод выключэнняў – невялікі, але змястоўны, яскравы і дынамічны папулярны артыкул А. Бацюкова [1]. Таму ўяўляецца неабходным акрэсліць інфармацыйны патэнцыял мемуарнага твора С.Маскевіча як крыніцы ваеннай гісторыі XVII ст.

Як вядома, арыгінал Дыярыуша не захаваўся. Вядомы некалькі рукапісных копій, старэйшай і найбольш поўнай з якіх з'яўляецца рукапіс з бібліятэкі Польскай акадэміі навук у Курніку (сігнатура №308). Упершыню надрукаваў тэкст на падставе няпоўнага кракаўскага спісу Ю.У. Нямцэвіч у 1822 г. У 1834 г. быў выдадзены пераклад помніка на рускую мову, зроблены з невядомага зараз рукапісу, які захоўваўся ў бібліятэцы езуіцкага калегіўма ў Полацку і ў 1833 г. трапіў у Пецярбург. У 1838 г. мемуары С. Маскевіча былі апублікаваны ў Вільні настаўнікам мясцовай губернскай гімназіі Янам Закрэўскім (менавіта гэтай кнігай карыстаўся М.М.Улашчык). Класічнай публікацыяй лічыцца выданне Дыярыуша С.Маскевіча і двух Дыярыушаў яго сына Багуслава Казіміра, здзейсненае ў 1961 г. А. Сайкоўскім [10].

На беларускую мову першым тэкст помніка пераклаў старэйшы беларускі літаратуразнавец-медыявіст А.Ф. Коршунаў, але, на жаль, навуковец не паспеў яго выдаць. Доўгі час пераклад А.Ф.Коршунава быў вядомы даследчыкам у некалькіх машынапісных копіях, пакуль урэшце не быў надрукаваны ў скарочаным выглядзе ў "Анталогіі даўняй беларускай літаратуры" (1-е выд. – 2003 г., 2-е – 2005 г.) [3]. У 2016 г. поўны тэкст помніка увайшоў у склад чарговага тому серыі "Помнікі даўняга пісьменства Беларусі" у перакладзе А.У.Бразгунова паводле выдання А. Сайкоўскага [6]. На гэты пераклад мы абапіраемся ў сваёй працы.

Самуіл Маскевіч нарадзіўся каля 1580 г. у Сэрвачы на Наваградчыне ў даволі радавітай і адносна заможнай шляхецкай сям'і. Яго бацька, Іван Сямёнавіч, перайшоў у кальвінізм, у якім

выхаваў і чатырох сваіх сыноў. Спачатку С. Маскевіч атрымаў адукацыю, магчыма, у Навагрудку. Далей – вайсковая служба. Служыў Самуіл у гусарыі – войску элітарным, што было сапраўдным гонарам Рэчы Паспалітай. Пачаўшы кар'еру таварышам гусарскай харугвы, мемуарыст да канца 1613 г. даслужыўся да звання палкоўніка. С. Маскевіч браў чынны ўдзел у многіх значных падзеях пачатку XVII ст.: у баявых дзеяннях са шведамі ў Інфлянтах і, верагодна, у пераможнай бітве пад Какенгаузенам у чэрвені 1601 г.; у падаўленні рокашу М. Забрыдоўскага; у выправе войскаў Рэчы Паспалітай у Маскоўскую дзяржаву ў 1609–1612 гг. Як трапна заўважыў А.Ф. Коршунаў, "адвага і разважлівасць, вясёлы нораў і сяброўскія адносіны да іншых, уменне быць галантным і цікавым кампаньёнам здабылі яму павагу не толькі сярод шляхты, але нават і арыстакратыі" [2, с. 265].

Аўтарытэт С. Маскевіча праявіўся і ў тым, што ў снежні 1613 г. ён быў у ліку чатырох дэпутатаў на экстраардынарны сейм у Варшаве ад канфедэрацыі, што дамагалася выплаты жаўнерам заробку за маскоўскую кампанію. Пэўны час С.Маскевіч знаходзіўся на службе ў магнатаў Радзівілаў. У 1617 г. навагрудскі сеймік абраў яго дэпутатам на Галоўны Трыбунал Вялікага Княства Літоўскага. У 1624 г. Самуіл ажаніўся з дачкой Паўла Пясецкага (імя яе невядома). Жонка нарадзіла яму дваіх дзяцей: сына Багуслава Казіміра і дачку Тарэзу. Дзякуючы цесцю, Самуіл пакінуў службу ў Радзівілаў і апынуўся ў атачэнні ваяводы навагрудскага Мікалая Крыштофа Сапегі, з рук якога атрымаў урад пісара гродскага навааградскага. Пазней, на пачатку 1630-х гг., стаў навагрудскім падваяводам. Памёр Самуіл Маскевіч паміж 1633 і 1642 гг., верагодна – каля 1640 г. [9, s. 173].

Паводле меркавання А. Сайкоўскага, С. Маскевіч напісаў свае мемуары ў 1625–1631 гг. [10, s. 55]. Сама назва "Дыярыуш" з'яўляецца ў дачыненні да іх дастаткова ўмоўнай, бо, нягледзячы на форму дзённіка, помнік мае ўсе прыкметы ўспамінаў. Даследчыкамі даўно заўважана, што твор, які ахоплівае 1594–1621 гг., па структуры неаднастайны. Умоўна ён распадаецца на тры часткі. Спачатку, у запісах за 1594–1605 гг. уключна, аўтар падае толькі скупыя звесткі дзённікавага характару. Затым інфармацыя паступова робіцца ўсё больш падрабязнай, сухая канстатацыя фактаў замяняецца вобразным сюжэтным апавяданнем. Асабліва змястоўна апісаны маскоўскі паход, знаходжанне ў Маскве і

канфедэрацкая дзейнасць мемуарыста адразу па вяртанні на радзіму. Звесткі з 1615 па 1621 гг. зноў скарачаюцца, набліжаюцца да дзённікавых запісаў (у нейкай ступені выключэннем падаюцца паведамленняі пад 1618 і 1620 гг.,). Завяршаецца Дыярыуш нечакана запісамі пра падрыхтоўку да вайны з туркамі ў 1621 г.

Дыярыуш С. Маскевіча ўтрымлівае інфармацыю пра агульны кантэкст ваенна-палітычнай гісторыі Рэчы Паспалітай канца XVI – пачатку XVII ст. Пачынаецца твор сціслымі звесткамі 1594 г. пра паўстанне С. Налівайкі. Мемуарыст у тых падзеях у сілу ўзросту ўдзелу не прымаў, а прывёў інфармацыю са словаў свайго брата Івана, які быў на полі пад Лубнамі [7, с. 28], дзе пасля больш чым двухтыднёвай аблогі войскамі польнага гетмана кароннага С.Жалкеўскага казацкага табару Налівайка быў палонены, адвезены да караля, а потым чвартаваны.

Маскевіч толькі згадвае выправу ў Мультаны і нават ў Інфлянты, хаця ў апошняй у складзе харугвы літоўскага падчашага Г.Войны ўдзельнічаў сам “на пары коней” [6, с. 22]. Па меркаванні В.У.Таранеўскага, “гэта, найхутчэй, тлумачыцца тым, што малады ваёўнік быў тады пачаткоўцам ў мілітарных справах, жаўнерам неспрактыкаваным і пераважна толькі сведкам таго, што дзеялася. Памяць мінулага блякла ад таго, што не самога мемуарыста было тое мінулае, што дарэчы абумовіла і бегласць падачы рэтраспектыўнага матэрыялу ў форме пагадавых запісаў, якія пакуль што ніяк не выяўлялі асобу аўтара-героя, а тым болей апавядальніка” [7, с. 28].

Даволі лаканічна паведамляе С. Маскевіч і тое, што ён ведаў пра Дзімітрыя, першага Самазванца, і яго выправу на Маскву, да якой мемуарыст збіраўся, але крыху не паспеў далучыцца. Нават калі гаворка ідзе пра далейшыя падзеі, непасрэдным удзельнікам якіх быў С. Маскевіч (супрацьстаянне рокашу М. Забрыдоўскага, падзеі Смуты ў Маскоўскай дзяржаве і інш.) і якія ён досыць разгорнута апісвае, варта памятаць, што мы бачым гэтыя падзеі праз прызму ўспрыняцця прадстаўніка сярэдняй шляхты, гусара войска Рэчы Паспалітай, які шмат чаго не ведаў пра сапраўдныя іх мэты і прычыны, матывы ўчынкаў дзяржаўных дзеячаў, прыхаваныя спружыны палітыкі. Але менавіта гэты ракурс бачання, уласцівы прадстаўнікам таго сацыяльнага слою, да якога належаў мемуарыст, можа быць каштоўны для даследчыка, зыходзячы з задач яго працы.

Пэўная інфармацыя ў мемуарах ёсць пра будову войскаў Рэчы Паспалітай і Маскоўскай дзяржавы. У прыватнасці, пра “крылатую”

гусарыю. Прыводзяцца звесткі пра колькасны склад вайсковых фарміраванняў (як і падобныя звесткі іншых апавядальных крыніц, яны патрабуюць да сябе крытычнага стаўлення), іх кіраўнікоў, перамяшчэнні і ўдзел у баявых дзеяннях.

Дыярыуш дазваляе вывучаць вайсковае майстэрства і тактыку як войскаў Рэчы Паспалітай, так і маскоўскіх войскаў і іншаземных фарміраванняў на маскоўскай службе, а таксама, у пэўнай ступені, характар дзеянняў казацкіх і татарскіх загонаў. У прыватнасці, з яго старонак мы даведваемся пра характар аблогі Смаленска і яго абарону; пра тактыку маскоўскіх войскаў, накіраваных Васілём Шуйскім для зняцця аблогі Смаленска, і пра контрдзеянні корпуса гетмана С.Жалкеўскага; пра змаганне рэчпаспалітаўскага кантынгенту ў Маскве.

Каштоўныя звесткі ўтрымліваюцца ў Дыярыушы пра канкрэтныя ваенныя падзеі, напрыклад, няўдалую спробу захопу Смаленска з дапамогай петарды – моцнага выбуховага прыстасавання накшталт міны; пра захоп пахолкамі Рослава; пра пераможную бітву пад Клушынам 4 ліпеня 1610 г., якая адкрыла каралеўскаму войску шлях да Масквы. Дарэчы, побач з лістамі і ўспамінамі С.Жалкеўскага [4], а таксама нататкамі Мікалая Мархоцкага [5], Дыярыуш С.Маскевіча з’яўляецца адной з важнейшых крыніц аб Клушынскай бітве. Хаця, у адрозненне ад названых помнікаў, ён не дае настолькі панарамную і поўную яе карціну, каштоўнасць апісання Маскевіча ў тым, што яно дадзена з пункту погляду ўдзельніка, што пабываў у самай гушчы бітвы, і выдатна перадае сам яе дух і адчуванні жаўнераў [гл. 6, с. 48–52].

Дыярыуш можа выступаць як крыніца рэканструкцыі ваеннай штодзённасці. Найперш, паўсядзённага жыцця кантынгенту Рэчы Паспалітай у Маскве, якое ўключала вырашэнне побытавых пытанняў, баляванні, добразычлівыя адносіны з маскоўцамі, зацікаўленасць іх дзяржаўным ладам і культурна-рэлігійнай традыцыяй, а гэтаксама выпадкі рабаўніцтва і гвалту, трывожнасць, чаканне ўдару, узмоцненыя варты, запрэжаныя коні, ўрэшце – ваеннае супрацьстаянне.

Мемуары С.Маскевіча ўтрымліваюць звесткі пра асобы вайскоўцаў ад военачальнікаў, такіх як гетман С.Жалкеўскі, смаленскі ваявода М. Шэін, ваявода Д. Шуйскі, кіраўнік “немцаў” на маскоўскай службе шведскі вайскаводца Я.П. Дэлагардзі, да простых жаўнераў. Пры гэтым аўтар аб’ектыўны як у адносінах да

суайчыннікаў, так і да ворагаў. Ён не толькі выяўляе сваё стаўленне ў характарыстыках кшталту: “...іх ваявода Шэін, воін добры, ўмелы і пільны ў рыцарскіх справах” [6, с. 34]. Найперш мемуарыст паказвае гэтых людзей праз дзеянні і ўчынкі, якія найбольш дакладна іх характарызуюць.

Пры гэтым С. Маскевіч не баіцца крытыкаваць нават тых военачальнікаў, якіх ён вельмі паважаў, калі яны таго вартыя. Калі з-за інтрыг С. Жалкеўскага, бясспрэчную ролю якога ў поспехах войска Рэчы Паспалітай падчас маскоўскай выправы мемуарыст паказаў вышэй, і іншых вайскаводцаў у 1618 г. было дапушчана бяздзеянне, у выніку чаго татары вывелі вялікі палон, Маскевіч даў вельмі эмацыйную ацэнку: “<...> Нашыя ж павяліся не як рыцары, а як сапраўдныя бабы ці, дакладней, прасталыткі: ніводзін не адважыўся выйсці з лагера! <...> Не знайшлося там настолькі дабрадзейнага мужа, сына, брата, які б тнуў шабляй калі не ў непрыяцеля, то ў самога военачальніка, праз якога дайшлі да падобнае шкоды. І так вораг, якому нават волас з галавы не спаў, пайшоў бяспечна з усім палонам і здабычай ...” [6, с. 131–132].

Зрэшты, мемуары дазваляюць атрымаць звесткі пра самога аўтара і яго лёс у віхуры бурлівых падзей пачатку XVII ст. – тыповы лёс прадстаўніка шляхецкага саслоўя.

Такім чынам, Дыярыуш Самуіла Маскевіча з’яўляецца каштоўнай крыніцай ваеннай гісторыі Рэчы Паспалітай і Маскоўскай дзяржавы пачатку XVII ст., якая дазваляе ўбачыць прычыны і характар ваенна-палітычных падзей праз прызму ўспрыняцця тыповага шляхціца-воіна, даследаваць будову войскаў, ваеннае майстэрства і тактыку, канкрэтныя падзеі, штодзённае жыццё вайскоўцаў, атрымаць звесткі пра асобы і лёсы военачальнікаў і простых жаўнераў, а таксама самога мемуарыста. У сваім творы С. Маскевіч імкнуўся да аб’ектыўнасці, яго інфармацыя верыфікуецца праз параўнанне з іншымі тагачаснымі крыніцамі. Але не менш каштоўны суб’ектыўны пачатак мемуараў, які, перадусім, і дазваляе адчуць дух эпохі.

**Спіс выкарыстаных крыніц**


1. Бацюкоў А. Авантура беларускай шляхты. *Найясьнейшая Рэч Паспалітая: Цывілізацыя-Культура-Рэлігія-Палітыка-Авантура-Героіка-Успамін* / уклад. А.Дзярновіч. Мінск: І.П.Логвінаў, 2007. С. 114–122.

2. Гісторыя беларускай літаратуры: старажытны перыяд : вучэб. дапам. / М. М. Грынчык, У. А. Калеснік, У. Г. Кароткі і інш.; пад агульн. рэд. М. А. Лазарука, А. А. Семяновіча. 3-е выд., стэр. Мінск : Выш. шк., 1997. 351 с.
3. Дыярыуш Самуіла Маскевіча (...). *Анталогія даўняй беларускай літаратуры: XI – першая палова XVIII стагоддзя* / НАН Беларусі, Ін-т літ. імя Я.Купалы ; падрыхт. А.І.Богдан [і інш]; навук. рэд. В.А.Чамярыцкі. 2-е выд., выпр. Мінск: Беларус. навука, 2005. С. 750–771.
4. Записки гетмана Жолкевского о Московской войне, изданные П.А.Мухановым. 2-е изд. СПб.: Тип. Э.Праца, 1871. XII, 130 с., 306 стб.
5. Мархоцкий Н. История Московской войны. М.: РОССПЭН, 2000. 223 с.
6. Самуэль Іванавіч Маскевіч (к. 1580–1642). Дыярыуш. *Дыярыушы XVII стагоддзя* (1594–1707 гады) / укл., пер. з пол. мовы: А.У.Бразгуноў; рэдкал.: А.У.Бразгуноў (старшыня) [і інш.]. Мінск : Беларус. навука, 2016. С. 21–151.
7. Таранеўскі В.У. Гісторыка-мемуарная літаратура Беларусі XVI–XVII ст.: метадычныя рэкамендацыі. Віцебск: ВДУ імя П.М.Машэрава, 2016. 55 с.
8. Улашчык М. Мемуары і дзённікі як крыніцы па гісторыі Беларусі: З рукапіс. спадчыны / уклад. Я.М.Кісялёва, В.У.Скалабан; рэдкал.: Н.М.Дзятчык і інш. Мінск : Пейто, 2000. 86 с.
9. Bauer M. Obraz państwa moskiewskiego i jego mieszkańców w pamiętniku Samuela Maskiewicza. *Napis*. 2006. Seria 12. S. 171–182.
10. Pamiętniki Samuela i Bogusława Kazimierza Maskiewczów / oprać., wsępem i przypisami opatrzył Alojzy Sajkowski. Wrocław : Zakład Narodowy im. Ossolińskich, 1961. 332 s.

* * *